Роўз Лагеркранц • Эва Эрыксан

# Маё сэрца скача ды смяецца



KOSKA,

# Маё сэрца скача ды смяецца



ТЭКСТ:

Роўз Лагеркранц

ІЛЮСТРАЦЫІ:

Эва Эрыксан

KOSKA

Мінск
Кандрусевіч Надзея
2023

УДК 821.113.6-93
ББК 84(4 Шве)-44
Л14

Пераклад са шведскай
*Надзі Кандрусевіч*

Пераклад зроблены паводле выдання:
Rose Lagercrantz • Eva Eriksson
*«MITT HJÄRTA HOPPAR OCH SKRATTAR»*
Bonnier Carlsen Bokförlag, Stockholm, 2012

**Лагеркранц**, Р.

Л14 Маё сэрца скача ды смяецца / Роўз Лагеркранц ; мастак Эва Эрыксан ; пер. са швед. Надзі Кандрусевіч. – Мінск : ІП Кандрусевіч Надзея, 2023. – 128 с. : іл.

ISBN 978-985-7277-12-4

Гэта кніга пра Дзюнэ.

Так, пра дзяўчынку, якая заўжды шчаслівая. Але ў той дзень Дзюнэ сядзела за сваёй партай у класе і глядзела на пустое месца побач. На месца, дзе раней сядзела яе найлепшая сяброўка Эла-Фрыда, перад тым як з'ехала ў Нарчопінг. З таго часу нікому нельга было сядзець там, бо дзе ж тады будзе сядзець Эла-Фрыда, калі вернецца?

УДК 821.113.6-93
ББК 84(4 Шве)-44

ISBN 978-985-7277-12-4

© Rose Lagercrantz, тэкст, 2012
© Eva Eriksson, ілюстрацыі, 2012
© Bonnier Carlsen Bokförlag, 2012
© Надзя Кандрусевіч, пераклад на бел. мову, 2023
© Выданне на бел. мове. ІП Кандрусевіч Надзея, 2023



ЗМЕСТ

Частка 1 ........................ 11

Частка 2 ........................ 16

Частка 3 ........................ 25

Частка 4 ........................ 29

Частка 5 ........................ 41

Частка 6 ........................ 45

Частка 7 ........................ 53









Частка 8 ........................ 61

Частка 9 ........................ 67

Частка 10 ........................ 83

Частка 11 ........................ 91

Частка 12 ........................ 101

Частка 13 ........................ 107

Частка 14 ........................ 115











# Частка 1

Прывітанне! З вамі зноў Дзюнэ! Так, тая самая шчаслівая дзяўчынка.

Праўда, часам яна сумуе, але гэта не лічыцца.

Насамрэч Дзюнэ не любіць сумаваць, бо тады яна зусім рассыпаецца на кавалачкі. Таму яна заўжды перапісвае сумныя казкі і прыдумляе ім добры канец.



Дзюнэ любіць марскіх свінак, ёй вельмі падабаецца майстраваць усякае рознае, паспаць зранку і гуляць з сябрамі.

Калі, вядома ж, побач ёсць з кім пагуляць.

Калі яна толькі пайшла ў школу, то зусім не ведала нікога ў класе, але цяпер ведае.

Яна ведае Метэборга і Кюдэ.

І яшчэ Юнатана, у якога дома 146 жывёл, і ўсе палачнікі.

Яны вельмі мілыя, Юнатан іх вельмі любіць.



І, вядома, яшчэ яна ведае Вікі. Яе ведаюць усе.

Вікі — дзяўчынка, якая бегае чысціць зубы кожныя пяць хвілін. Яе мама — стаматолаг. Яна дае ёй адмысловую вадкасць са фторам, каб паласкаць рот штодзень.

Вікі закаханая амаль у кожнага хлопчыка ў класе. Гэта адбываецца вельмі хутка. Пфф! — і ўсё, яна зноў закахалася!

Яе сяброўка Мікі такая ж.





У той дзень, пра які ты зараз пачуеш, дзяўчынкі закахаліся ў Кюдэ.

Адначасова…

Яны хацелі запытацца ў Кюдэ,
хто з іх падабаецца яму больш.
Яны вельмі хваляваліся.

— Я падабаюся яму больш, — упэўнена сказала Мікі ды задаволена паглядзела на вялікае сэрца з паперы, якое яна толькі што выразала.

— Паглядзім, — запярэчыла Вікі і таксама стала маляваць сэрца.

Вікі і Мікі ўвесь час паўтараюць адна за адной.

# Частка 2

Як толькі скончыўся ўрок і пачаўся перапынак, дзяўчынкі кінуліся да Кюдэ і ўчапіліся ў яго.

— Скажы, што табе падабаюся я! — закрычала Вікі.

— Не, скажы, што я! — крычала Мікі.

Кюдэ вызваліўся і збег, нічога не адказаўшы.

На такое ў яго няма часу.

Ён мусіць трэніравацца забіваць галы.



Хутка Кюдэ вярнуўся.

Але ён зусім не збіраўся размаўляць з дзяўчынкамі.



Ён вярнуўся, каб сказаць, што яму падабаецца…



…Дзюнэ. А потым дастаў з кішэні жуйку і пачаставаў Дзюнэ.

А потым зноў пабег на трэніроўку.

Калі яго футбольная каманда прайграе хаця б адзін раз, яго тата вельмі раззлуецца. Тата можа раззлавацца вельмі моцна! Бедны трэнер!

Дзюнэ панюхала жуйку.

Яна пахла малінай.





Калі Дзюнэ ўзняла галаву, Вікі ды Мікі ўжо не было. Яны збеглі на двор і скакалі ў класікі.

Дзюнэ пабегла за дзяўчаткамі ды запыталася, ці можна ёй з імі, але Вікі не адказала. Яна паглядзела на Дзюнэ, як на пустое месца.

Так звычайна кажуць, калі нехта робіць выгляд, што цябе не заўважае.

А Мікі зрабіла такі твар, нібыта праглынула гнілы банан.



Дзюнэ вельмі засмуцілася, бо самае важнае ў школе — гэта сябраваць з усімі.

— Вы можаце ўзяць маю жуйку, калі хочаце, — прапанавала яна.

— Не, дзякуй, — хмыкнула Мікі. — У школе нельга жаваць жуйкі.



— Ты што, не ведала пра гэта? — шыкнула Вікі ды пабегла да дзіцячай пляцоўкі.

Дзюнэ стаяла і глядзела ўслед дзяўчаткам. Потым яна падышла да сметніцы і выкінула жуйку.

# Частка 3

Пасля таго перапынку Дзюнэ засумавала.

Яна вельмі моцна захацела да сваёй лепшай сяброўкі Элы-Фрыды, якая пераехала ў Нарчопінг.

З таго часу нікому нельга было сядаць на месца Элы-Фрыды побач з Дзюнэ. Ні Юнатану, ні Сюзі, нікому... нават...



...Кюдэ. Калі ён аднойчы падышоў

і запытаўся, Дзюнэ толькі

паматляла галавой.



— А дзе тады будзе сядзець Эла-Фрыда?

Кюдэ здзіўлена паглядзеў на яе.

— Я маю на ўвазе, калі яна вернецца, — патлумачыла Дзюнэ.

— Мілая Дзюнэ, — уздыхнула настаўніца, якая чула іх размову, — Эла-Фрыда не вернецца.

— Адкуль вы ведаеце? — прамармытала Дзюнэ.

Дзюнэ працягвае спадзявацца, нават калі ўсё здаецца безнадзейным.

Але наогул Дзюнэ прымае жыццё такім, як ёсць.

У панядзелак — фізкультура.

Па серадах — слоўнікавая дыктоўка.

Самае класнае з дыктоўкай — гэта тое, што настаўніца наклейвае табе ў сшытак залатую зорачку, калі ўсе словы напісаныя правільна.

І штодзень у дзесяць сорак пяць у іх перапынак на абед.



# Частка 4

У сталоўцы Дзюнэ таксама сядзела побач з Элай-Фрыдай. Кожны дзень. У самым дальнім куце.

Дзюнэ незаўважна прайшла туды са сваёй ежай. Сасіскі ды пюрэ з бульбы.

Яна хацела пабыць адна і падумаць пра штосьці вясёлае.

Яна ў гэтым сапраўдны майстар!

Спачатку Дзюнэ ўзгадала і падумала пра ўсіх марскіх свінак, якіх яна толькі ведала.

Аднаго завуць Пацібой, і яшчэ аднаго — Пуся.

І пра сваіх марскіх свінак — Сняжка і Сняжынку.



Потым яна падумала пра розныя месцы, дзе яна была.

Пра горад Рым. Там жыве яе бабуля, мама таты.

І Рупстэн. Там жывуць яе дзядуля і бабуля, тата і мама яе мамы.

І Нарчопінг. Там, дзе цяпер жыве Эла-Фрыда.

Гэта самы класны горад, дзе толькі была Дзюнэ.

Там ёсць парк, дзе растуць самыя розныя дрэвы. Па некаторых вельмі лёгка караскацца, а па іншых цяжкавата. Тым разам, калі Дзюнэ там была ў гасцях у Элы-Фрыды, яна вырашыла залезці на самае складанае дрэва. Гэта было дрэва, на якім не было ніводнай нізкай галінкі.



Галіны пачыналі расці так высока, што Дзюнэ і Эле-Фрыдзе давялося прынесці крэсла, каб забрацца на дрэва.

Яны лазілі там некалькі гадзін і гулялі ў гульню, нібыта яны малпы.

Гэта было на вясновых вакацыях.

Так даўно…

Яны размаўлялі на мове малпаў, якая збольшага складаецца з розных гукаў.

Вядома, яны елі бананы і трэніраваліся вісець на хвастах.



Але ў іх не было ніякіх хвастоў, таму яны віселі на руках ды нагах.

Дзюнэ і Эла-Фрыда злезлі з дрэва зусім ненадоўга, каб збегаць дадому і прынесці яшчэ бананаў.



Калі яны вярнуліся, крэсла кудысьці знікла.

Тады яны прыцягнулі яшчэ адно.
Як бы інакш яны залезлі на дрэва?

Дзяўчынкі гулялі ў малпаў на дрэве ажно да самага вечара. Потым яны зноў пабеглі дадому і спявалі на ўсё горла. Вядома, песні малпаў.

Ззяў месяц, лісточкі на дрэве шамацелі, а дзесьці паблізу брахаў сабака.
І ўсё было так здорава, як бывае толькі ў Нарчопінгу.







Але на наступны дзень знікла ўжо і другое крэсла.

Нейкая таямніца.

Мама Элы-Фрыды насварылася на іх і забараніла браць яшчэ крэслы.

І запасны тата Элы-Фрыды быў з ёй цалкам згодны.

У Элы-Фрыды было два таты. Адзін сапраўдны, пра якога яна ніколі не гаварыла, і адзін запасны тата, якога звалі Ульф.

Хаця Эла-Фрыда называла яго Уфэ.

Уфэ сказаў, што кухонныя крэслы мусяць стаяць на кухні, а не ў парку.

Тады яны скончылі гульню ў малпаў і пайшлі гуляць са сваімі марскімі свінкамі.

Гэта таксама было весела.



# Частка 5



Калі Дзюнэ сядзела вось так у школьнай сталоўцы і ўзгадвала пра тое, як весела ім было ў Нарчопінгу, да яе падышла настаўніца.

— Чаму ты нічога не ясі? — запыталася яна.

Дзюнэ здзіўлена паглядзела на сваю талерку. Яна зусім забылася, дзе знаходзіцца.

— Давай цяпер ты пойдзеш і нарэшце сядзеш з іншымі.

Дзюнэ паднялася. Настаўніца ўзяла крэсла і панесла туды, дзе сядзелі дзеці. Дзюнэ неахвотна ішла за ёй.

«Ну і куды настаўніца мяне пасадзіць? О не! Толькі не паміж Вікі ды Мікі!»

— Толькі не тут... — прамармытала Дзюнэ сабе пад нос.

І яна мела рацыю.

Вікі з Мікі спрабавалі гучна пратэставаць, калі настаўніца паставіла крэсла Дзюнэ паміж імі.

— Не-е-е, — прастагнала Вікі. — Я зараз страчу прытомнасць!

— Мы думалі сядзець разам да самай смерці, — запратэставала Мікі.

Але ім давялося пусціць Дзюнэ.

Яны не змаглі пярэчыць настаўніцы.



І Дзюнэ ўціснулася між імі, пацягнулася па бутэльку з кетчупам і выціснула крыху сабе на талерку.

Не паспела яна паставіць бутэльку на месца, як яе схапіла Вікі.

— Глядзі, — сказала яна, — я таксама ўзяла гэтую бутэльку, хоць яе толькі што трымала Дзюнэ.

Нібыта ў Дзюнэ была нейкая заразная і вельмі небяспечная хвароба!

— І я таксама, — сказала Мікі ды ўзяла бутэльку. — Буэ-э-э!

Дзюнэ спрабавала рабіць выгляд, нібыта нічога не заўважае, нібыта ўсё нармальна.

# Частка 6

А потым здарылася нешта жудаснае.

Вікі моцна ўшчыкнула Дзюнэ за руку.





Дзюнэ працягвала рабіць выгляд, што нічога не адбываецца.

«Не звяртай увагі на ўсялякія глупствы», — звычайна казаў яе тата.

Але неўзабаве яна адчула, што Мікі таксама яе ўшчыкнула.

Яшчэ мацней!

І цяпер было ўжо сапраўды балюча!

Яны шчыпалі яе, пакуль Дзюнэ не падскочыла з крэсла.

Яна хуценька паглядзела навокал, узяла бутэльку з кетчупам і з усяе моцы выціснула яго на Мікі.

ПЫРСЬ! — пырснуў кетчуп, вылятаючы з бутэлькі.

…акурат у самы лоб Мікі.



Дзюнэ павярнулася і нацэлілася на Вікі.

ПЫ-ЫРСЬ! ПЫ-ЫРСЬ!

Але гэтым разам яна прамазала,
і кетчуп трапіў... у настаўніцу.

Дзюнэ войкнула...







...і адпусціла бутэльку.

Яна кінулася да дзвярэй.

Там яна абярнулася. Што яна нарабіла?

— Стой, — закрычала настаўніца. — Дзюнэ, стой!

Але Дзюнэ зрабіла выгляд, што не чула яе, і пабегла прэч.

Яна выбегла са сталоўкі, потым са школы і з усіх ног кінулася дадому.

# Частка 7

Дом, у якім жыла Дзюнэ, стаяў на вуліцы Хумлевэген побач з вялікай гарой.

Зімой тут заўжды шмат дзяцей, якія гуляюць у снежкі ды коўзаюцца на санках.

Але цяпер, вясной, трава на гары была зялёная і ўся ў блакітныя кветачкі. Яны называліся пралескі.

Праўда, у той дзень Дзюнэ зусім не думала пра нейкія там кветачкі.

Яна іх нават не бачыла. Яна хацела хутчэй дабрацца дадому!

Дзверы былі зачыненыя. Так было заўжды, калі яе тата на працы.

Але, на шчасце, Дзюнэ ўзгадала, што пад вазонам з кветкамі на ганку звычайна ляжаць запасныя ключы.



Дзюнэ трэба было толькі ўзяць ключы, адчыніць дзверы, забегчы ў дом і зняць свае кеды.

Адзін кед паляцеў на паліцу для кепак.

Другі — на маленькі столік, дзе стаяла ваза.



Ваза ўпала на падлогу ды разляцелася на дробныя кавалачкі.

Здавалася, што Дзюнэ таксама ўся развалілася ды раскісла.



Дзюнэ села на падлогу і заплакала.

Спачатку яна плакала, бо разбілася ваза. Потым — што яна распырскала кетчуп на сваю добрую настаўніцу. А потым — што Вікі з Мікі такія злыя.

А больш за ўсё яна плакала, таму што Эла-Фрыда ўсё яшчэ не вярнулася.

Дзюнэ плакала так моцна, ажно пачырванелі вочы, як у белага трусіка.



Марскія свінкі занепакоена сачылі за Дзюнэ. Звычайна, калі Дзюнэ вярталася дадому, яны бегалі па клетцы і пішчалі, не знаходзячы сабе месца ад радасці. А цяпер яны сядзелі нерухома, склаўшы лапкі, і глядзелі на Дзюнэ.



Марскія свінкі — вельмі адчувальныя жывёлкі. Калі яны заўважаюць, што іх мамы нешчаслівыя, яны таксама сумуюць. А Дзюнэ для іх нібы мама.

Яны любяць яе, што б яна ні нарабіла, і заўжды на яе баку.

Сняжынка думала, што гэта нават добра, што Дзюнэ распырскала кетчуп. Трэба ж было абараняцца!

А Сняжку падабалася, калі адбывалася нешта цікавае.

Раптам з залы пачуўся нейкі гук.

Дзюнэ хуценька ўскочыла на ногі ды прыціснулася вухам да дзвярэй.

Ага, гэта тата!

Па серадах ён вяртаўся з працы раней.



## Частка 8

Дзюнэ чула, як адчыняецца шафа з вопраткай. Дзверцы крыху рыпелі.

Тата дастаў сваю вопратку для бегу.

Кожную сераду ён звычайна выпраўляўся на прабежку ў лес.

А потым усё сціхла.

Пачуліся крокі…

Дзюнэ хуценька павярнула ключ у замку. У самы апошні момант!

Тата тузануў за дзвярную ручку.



— Дзюнэ, — паклікаў ён. — Чаму ты не ў школе?

Дзюнэ сціснула вусны.

— Нешта здарылася? — працягваў тата.

Цішыня.

— Гэта ж не праз вазу? Шкада, вядома, што яна разбілася, але такое здараецца. Што важней, як думаеш? Мая маленькая дзяўчынка? Ці старая ваза? Адчыні дзверы, калі ласка!

Але Дзюнэ не слухалася тату. Упершыню. Яна думала, што ніколі не раскажа яму, што здарылася ў школе.

Яна б і не паспела, бо раптам зазваніў тэлефон. Тата адышоў ад дзвярэй і пайшоў адказваць.

Але хутка тата вярнуўся.

— Ну цяпер выходзь! — злосна запатрабаваў ён. — Нам трэба пайсці ў школу і папрасіць прабачэння ва ўсіх, каго ты абліла кетчупам!



Дзюнэ гучна крыкнула і кінулася на падлогу.

— Я паміраю, — патлумачыла яна марскім свінкам. — Так яму і трэба!

Марскія свінкі прыціснуліся адна да адной і застукалі зубкамі. Усе марскія свінкі так робяць, калі хвалююцца.

Хутка тату надакучыла стаяць пад дзвярыма, і ён сышоў.



# Частка 9

Прайшло яшчэ крыху часу перад тым, як Дзюнэ змагла думаць аб нечым іншым. Так як яна звычайна рабіла, калі сумавала. Аб нечым вясёлым.

Думкі ляталі ў галаве, нібы мітуслівыя матылькі, якія не ведаюць, куды ім прызямліцца.

І тут яна зноў падумала пра Нарчопінг.

І адразу ж стала неяк лепш.

Можна заўжды падумаць пра Нарчопінг, калі сумна. Адзінае непрыемнае, што можа там здарыцца, дык гэта тое, што трэба вяртацца дадому.

Прынамсі, так было з Дзюнэ, калі яна гасцявала ў Элы-Фрыды на вясновых вакацыях.



Акурат калі ім было весялей за ўсё, прыехаў тата Дзюнэ, каб адвезці яе дадому.

Яны толькі што зрабілі аперацыі лялькам Элы-Фрыды і ўсім жывёлам і паклалі іх у ложачкі, як з'явіўся тата.

Настаў час развітвацца і вяртацца на вуліцу Хумлевэген у Стакгольм.

— Але ж спачатку мы вып'ем па кубачку кавы? — прапанавала мама Элы-Фрыды.

— Так, з задавальненнем, — згадзіўся тата Дзюнэ, і яны зніклі на кухні.

І тут у Элы-Фрыды з'явілася ідэя.

— Давай збяжым! — прашаптала яна на вуха Дзюнэ.



Сказалі — зрабілі!

Эла-Фрыда хуценька сабрала ўсё,
што можа спатрэбіцца, калі ўцякаеш з дому:
коўдру, кавалак каўбасы, дзве падушкі,
дзве зубныя шчоткі, ліхтарык і яшчэ
некаторыя дробязі і крыху смачненькага.

А Дзюнэ хуценька схапіла кнігу,
скрыначку з пластырам, нажніцы,
пару яблыкаў і некалькі цацачных жывёл,
якія ўжо паправіліся.

Яны скінулі ўсё гэта на прасціну
і завязалі ў вузел. Атрымаўся
вялізны мяшок.

— Трэба не забыцца ўзяць з сабой крэсла, — нагадала Эла-Фрыда.

Яе план быў уцячы на малпіна дрэва.

Там, наверсе, іх дакладна ніхто не знойдзе.

Яны крадком выйшлі з дому.

Ціха-ціха, нібыта зладзеі пасярод ночы.

Ніхто нічога не заўважыў.







Але не паспелі яны залезці на дрэва, як зразумелі, што забылі самае галоўнае — парасон!

Бо пачалася сапраўдная навальніца. Яны ўсе прамоклі наскрозь. І іх бедныя жывёлкі таксама.



У рэшце рэшт ім давялося бегчы дадому з цацкамі, каб маленькія небаракі зноў не захварэлі.

Вось такія атрымаліся ўцёкі.

Дождж біў ім проста ў твар. Трава і дрэвы нахіліліся ад ветру ва ўсім Нарчопінгу.

Прасціну, якая ўся прамокла наскрозь, яны пакінулі на дрэве. Астатнія рэчы схавалі між галінаў.

А пра крэсла яны, як звычайна, забыліся.

Гэтым разам мама Элы-Фрыды
ні слова не сказала пра крэсла.
Яна проста насварылася на іх,
бо яны збеглі ў такую непагадзь.

А тата Дзюнэ сказаў, што час развітвацца.

А потым яны пайшлі ў машыну
і зашпілілі рамяні бяспекі.

Дзюнэ ніколі не забудзе, як яна сядзела
на заднім сядзенні ды глядзела на шкло
машыны, па якім сцякалі кроплі дажджу
разам са слязамі па яе шчоках.

Але толькі яны збіраліся ад'ехаць,
прыбегла Эла-Фрыда, уся мокрая,
нібы русалка.



— Пачакайце! — закрычала яна. —
Я зусім забылася на развітальны падарунак!

Падарункам быў альбом вершаў,

такая маленькая кніжачка, дзе сябры

пішуць прыгожыя вершыкі на памяць.



Пакуль усе старонкі былі пустыя акрамя адной — першай.

На ёй было напісана прыгожым почыркам Элы-Фрыды:

*Бярозка я, а ты зялёны гай.*
*Сябровачка, мяне не забывай!*

*Ніколі не забывай*
*сваю найлепшую ў свеце*
*сяброўку Элу-Фрыду!*

# Частка 10

Кожны раз, калі Дзюнэ чытае гэты вершык, яна шчаслівая!

Асабліва ў самым канцы:

*Ніколі не забывай*
*сваю найлепшую ў свеце*
*сяброўку Элу-Фрыду.*

Нібыта яна калісьці зможа яе забыць!



Вядома, часам яна забывае тое-сёе. Напрыклад, куртку ці шапку, калі вяртаецца дадому са школы. Такое здараецца даволі часта.

Пра заплечнік можна нават і не казаць.

Часам яна таксама забывае сваю спартовую торбу.

І падручнікі. І кантэйнер з ежай.

Так, Дзюнэ сапраўды часта забывае. Вось цяпер яна ўжо забылася, чаму разлавалася на тату.

А што там наогул адбываецца? Чаму ён больш не грукаецца ў дзверы?

Дзюнэ паднялася з падлогі, адчыніла дзверы ды высунула нос.

О, як смачна пахне!

Дзюнэ пайшла ў кухню, адкуль ішоў пах. Там стаяў тата. Ён адсунуў крэсла і запрасіў Дзюнэ сесці.

— Любая, — сказаў ён. — Ці не жадае паненка пакаштаваць гарачых блінцоў?



— Вядома, — адказала Дзюнэ, а потым накінулася на бліны і з’ела столькі, што ледзь не лопнула.

Потым Дзюнэ адхінулася назад на крэсле і заплюшчыла вочы. Цяпер ёй трэба адпачыць.

Але ў таты іншыя планы.

— Ну а цяпер хадзем, — сказаў ён. — Яны нас чакаюць.

— Хто «яны»? — запыталася Дзюнэ.

— Настаўніца і дзяўчынкі.

Дзюнэ не паверыла сваім вушам. Усё пачынаецца наноў!

— Дзюнэ, — строга сказаў тата, — ты ж разумееш, што нельга проста так распырскваць кетчуп на людзей і не прасіць прабачэння! У нашай сям’і так не робяць.

Тата можа гаварыць колькі заўгодна. Дзюнэ не збіраецца нікуды ісці з ім.

Але тата не здаваўся.



— Ты можаш адказаць на маё пытанне? — папрасіў тата і ўважліва паглядзеў на Дзюнэ. — Навошта ты гэта зрабіла? Ты ведаеш, што я маю на ўвазе…

Тады Дзюнэ закасала рукавы.



Тата знерухомеў.

— Што гэта? — запытаўся ён.

— Сляды ад шчыпкоў, — прамармытала Дзюнэ.

— Шчыпкоў? — абурыўся тата. — Вы што, шчыпаецеся ў школе?

Дзюнэ пакруціла галавой.

— Не, толькі Вікі ды Мікі...

Больш яна нічога не паспела расказаць, бо тата выскачыў з-за стала і пабег у вітальню. Ён моўчкі накінуў на сябе куртку і адчыніў дзверы.

Што ён там яшчэ прыдумаў?

Дзюнэ хуценька ўскочыла на ногі. Лепш было пайсці з ім.

Але куды падзеліся яе кеды? Адзін кед яна знайшла на палічцы з кепкамі. Другі ляжаў на маленькім століку, дзе раней стаяла ваза.

— Пачакай мяне! — закрычала яна і пабегла за татам.

# Частка 11

Дзюнэ дагнала тату толькі перад самай школай. Які ж ён быў злосны!

Тата расчыніў дзверы ў клас і зайшоў. У класе ўсе адразу ж сціхлі. Здавалася, што дзеці гулялі ў гульню «не варушыся».

Мікі, якая ішла да настаўніцы, каб тая дапамагла ёй з нечым, таксама знерухомела.

Вікі схавалася за падручнікам па матэматыцы.

— Магчыма, вы ведаеце, чаму мы тут, — прагрымеў тата Дзюнэ і азірнуўся.

Ніхто не адказаў.

Нарэшце Кюдэ падняў руку:

— Таму што Дзюнэ мусіць папрасіць прабачэння!



— Няправільны адказ, — адрэзаў тата Дзюнэ. — Дзюнэ не мусіць прасіць прабачэння! А вось некаторыя з гэтага класа мусяць!

Тата паглядзеў на Мікі, але яна зрабіла выгляд, што нічога не разумее.

Ён азірнуўся на Вікі.

Але Вікі зрабіла выгляд, што нешта падлічвае.

Тады тата паклікаў Дзюнэ, якая схавалася ў яго за спінай, і закасаў яе рукавы.

— Хто-небудзь можа мне адказаць, чаму Дзюнэ выглядае вось так?

Усе глядзелі на рукі Дзюнэ.

— Паглядзіце! — сказаў тата і паказаў. — Паглядзіце, якія сінія адмецінына! Вось тут, і вось тут, і вось тут...



Цяпер увесь клас заварушыўся.
Усе хацелі паглядзець на сляды ад шчыпкоў
на руках Дзюнэ. Усе, апроч Мікі,
якая хуценька села за сваю парту.

І Вікі, якая сядзела і перагортвала старонкі
ў сваім падручніку па матэматыцы.

Настаўніца нахілілася да Дзюнэ.

Яна глядзела на сінякі Дзюнэ даўжэй за ўсіх.

— Ага, цяпер я, здаецца, пачынаю
разумець, — прамармытала яна.

Па яе голасе было чуваць, што яна
таксама злуецца, як і тата Дзюнэ.

Настаўніца пакруціла галавой
і накіравалася да Вікі з Мікі.



— Мікаэла, што гэта значыць?

— Мы… мы проста гулялі! — прапішчала Мікі.

— Гулялі?! — абурылася настаўніца. — А Дзюнэ хацела гуляць з вамі?

Некалькі секунд яна маўчала.

— Не, але Вікі таксама шчыпалася… — прапішчала Мікі.

Настаўніца павярнулася да Вікі.



— Вікторыя, гэта праўда?

— Я не ведала, што застануцца сляды, — прамармытала Вікі.

Настаўніца выпрасталася і абвяла позіркам увесь клас.

— Гэта сапраўды вельмі сумна, — уздыхнула яна. — Хто-небудзь яшчэ сутыкаўся з такім?

Зноў цішыня.

— Я, — нарэшце адгукнуўся Юнатан. — Вікі ды Мікі ўвесь час мяне шчыпаюць.

Сюзі таксама ўзняла руку.



— Са мной таксама здарылася штосьці сумнае.

— Так? — пацікавілася настаўніца.

— Мой хамячок памёр.

— Але ж у гэтым няма віны Мікі ці Вікі, — сказаў Кюдэ.

— Не, але гэта ўсё адно сумна.

Вось такая гісторыя адбылася ў класе ў той дзень.

Магчыма, у іншых класах у іншых дзяцей такіх гісторый шмат, але пра гэта не так часта гавораць.

Раптам здарылася штосьці нечаканае.

Дзверы зноў расчыніліся.

І як вы думаеце, хто стаяў на парозе?..

# Частка 12

...Эла-Фрыда!



Яна проста стаяла і ўсміхалася.

У класе пачалі шаптацца.

— Што яна тут робіць? — закрычаў Бэні.

Але Эла-Фрыда, здаецца, не чула.

Яе вочы бегалі па пакоі.

Калі яна заўважыла, што крэсла Дзюнэ пустое, усмешка знікла.

— А дзе Дзюнэ? — запыталася яна.

Дзюнэ стаяла зусім збітая з панталыку. Усё было нібыта ў сне.

У рэшце рэшт Дзюнэ апрытомнела і кінулася да Элы-Фрыды.

Эла-Фрыда радасна закрычала:

— Ура! Гэта ты!



А потым у клас зазірнуў запасны тата Элы-Фрыды — Уфэ.

— Прабачце, што мы перашкаджаем вам, — выбачыўся ён. — Я мушу быць на важнай сустрэчы...

Настаўніца запытальна паглядзела на яго.

— Вось у чым справа, — паспрабаваў патлумачыць ён. — Сёння ранкам, калі я з’язджаў з Нарчопінга, я быў упэўнены, што еду ў машыне адзін. Але калі я прыехаў у Сёдэртэлье, я пачуў, як хтосьці чхнуў.

— Сапраўды? — запыталася настаўніца.

— Аказваецца, Эла-Фрыда схавалася пад коўдрай на заднім сядзенні, — працягваў Уфэ. — Яна зусім незаўважна забралася ў машыну. Яна мусіць сустрэцца з Дзюнэ, патлумачыла яна...

— Як добра, — перабіў яго тата Дзюнэ. — Пакідайце Элу-Фрыду тут! Мы пабудзем з ёй.

У наступны момант зазвінеў званок. Надышоў час абедаць.

Усе заспяшаліся ў сталоўку, бо там заўжды даўжэзныя чэргі, асабліва ў абед. Асабліва калі даюць булачкі ці абаранкі. Ці салату з садавіны, ці сасіскі, ці вафлі. Але вафлі бываюць вельмі рэдка, амаль ніколі.

Звычайна ім даюць яблыкі ці сухарыкі.

Гэта таксама смачна.

Вікі з Мікі паспрабавалі збегчы разам з іншымі, але настаўніца іх спыніла.

— А вы заставайцеся тут! — сказала яна.



# Частка 13

Як толькі Дзюнэ і Эла-Фрыда прыбеглі ў сталоўку і атрымалі свае яблыкі, яны кінуліся да стала ў самым куце. Акурат як яны рабілі раней.

Але там ім не далі пабыць у спакоі.

Усе хацелі сустрэцца з Элай-Фрыдай і расказаць, што здарылася апошнім часам.

Метэборг хацеў расказаць, як яму на галаву зваліўся кавалак лёду. Хаця Ірма сцвярджала, што там быў усяго толькі маленькі кавалачак.

Сюзі хацела расказаць пра свайго памерлага хамяка. Яго звалі Люрван.



Юнатан хацеў паказаць свае брэкеты, якія яму ўставіў зубны доктар.

А потым прыйшлі Кюдэ і Бэні. Яны паклікалі ўсіх на школьны двор — гуляць у хованкі.

У гэтую гульню весялей за ўсё гуляць, калі шмат дзяцей.

Усе гулялі разам, акрамя Вікі ды Мікі.

Яны засталіся ў класе на ўвесь перапынак і размаўлялі з настаўніцай і татам Дзюнэ.





У школе Дзюнэ вельмі добры школьны двор.

Там ёсць дзве спартовыя пляцоўкі, шэсць арэляў, дзве пляцоўкі, каб гуляць у класікі, і даволі вялікае футбольнае поле.

Але самае лепшае ў двары — дрэва для хованак. Там, дзе цяпер стаіць Кюдэ і лічыць да ста, пакуль астатнія разбягаюцца і хаваюцца.



Дзюнэ і Эла-Фрыда пабеглі да будкі, дзе ляжалі рэчы для спорту і ўсялякія цацкі, але там было занята.

Там схаваліся Метэборг і Бэні.






Дзюнэ і Эла-Фрыда пабеглі да сіняй скрыні, дзе быў пясок.

Але там ужо ляжаў Юнатан.

Тады яны пабеглі да лесвіцы, але пад ёй таксама ўжо набілася куча народу: Сюзі, Віктар, Ірма, Габрыель і Енс.



— Давай схаваемся за самім дрэвам, — прапанавала ўрэшце Эла-Фрыда. — Кюдэ ніколі не будзе шукаць там!

Але як толькі Кюдэ пачаў шукаць, зазвінеў званок на ўрок.

Як заўсёды!



# Частка 14

Каля дзвярэй класа чакалі Вікі і Мікі.

Цяпер у іх былі чырвоныя вочы, як у белых трусікаў. Бачна было, што яны плакалі.

Настаўніца сказала, што паразмаўляе з іх бацькамі.

Але перш за ўсё дзяўчынкі мусілі папрасіць прабачэння ў Дзюнэ. Аднак яны не хацелі.

— Колькі нам яшчэ чакаць? — запытался настаўніца.



Вікі ды Мікі проста глядзелі перад сабой і маўчалі.

Нічога не адбывалася.

Усім было цікава, як прагучыць прабачэнне. Але шмат хто ўжо стаміўся стаяць і чакаць.

— Ну, — сказала настаўніца.

Вікі і Мікі стаялі нерухома і моўчкі, нібыта статуі.

У рэшце рэшт Дзюнэ сказала, што прасіць прабачэння не трэба.



— Я вам прабачаю ў любым выпадку, — сказала яна.

І ўсе выдыхнулі. Драма скончылася. Усе забеглі ў клас.

А тата Дзюнэ змог нарэшце выправіцца на сваю прабежку ў лес.

Эла-Фрыда ўселася на сваім старым месцы.

Як жа ёй пашанцавала, што яно было вольнае!

— Дзюнэ, — запыталася яна, — а чаму Вікі і Мікі мусяць прасіць у цябе прабачэння?

— Таму што мне давялося пырснуць у іх кетчупам, — адказала Дзюнэ.

— Зразумела, — сказала Эла-Фрыда.

Хаця яна зусім нічога не зразумела.

Але якая розніца? Самае галоўнае, што яе старое месца не было занятае.

— На гэтым уроку мы будзем маляваць рыбак, — патлумачыла настаўніца, калі ўсе ў класе супакоіліся і нарэшце стала ціха.

Яны акурат мусілі маляваць рыбак на гэтым рыбным тыдні, а таксама крэветак, крабаў і вустрыц.

Дзюнэ і Эла-Фрыда намалявалі кожная свайго шчупака з вострымі, як іголкі, зубамі.

А потым настаўніца папрасіла, каб вучні дасталі свае сшыткі для запісаў.




*Маё шчаслівае жыццё.*

Так называўся сшытак Дзюнэ.

Апошні раз яна пісала там сто год таму. І здавалася, што сёння туды таксама не будзе чаго запісаць.

Дзюнэ сядзела, круціла ў руцэ асадку і ўсміхалася Эле-Фрыдзе, якая атрымала чысты аркуш паперы.



— Пачынайце, — сказала настаўніца.

— Што б такое прыдумаць? — запыталася Дзюнэ.

— Проста напішы пра які-небудзь выпадак, калі ты была шчаслівая, — прапанавала настаўніца.

— Я заўсёды шчаслівая, — патлумачыла Дзюнэ.

Вось так вось. Дзюнэ не лічыць тыя выпадкі, калі яна нешчаслівая.

— Тады напішы пра дзень, калі ты была асабліва шчаслівая, — прыдумала настаўніца.

Дзюнэ схілілася над сваім сшыткам.

*«Я заўсёды асабліва шчаслівая, калі побач Эла-Фрыда...»* — пачала пісаць Дзюнэ.

Эла-Фрыда нахілілася і прачытала, што напісала Дзюнэ.

Потым яна напісала ў сябе нешта падобнае:

*«Я заўсёды асабліва шчаслівая, калі я з Дзюнэ...»*

Яна не паўтарала за Дзюнэ.
Эла-Фрыда ніколі не паўтарала за ёй.
Але яна часта рабіла так жа, як і Дзюнэ.

Усё было амаль як у той час,
калі яны сядзелі за адной партай кожны дзень.
Хаця тады Дзюнэ не думала так шмат,
якая яна шчаслівая. Не кожную секунду.
Тады на гэта зусім не было часу.
Цяпер яна таксама не думае пра гэта.
Яна думае толькі: У цэлым свеце не так шмат
людзей, якія б падабаліся адно аднаму так,
як мы з Элай-Фрыдай!
А потым Дзюнэ трэба было падумаць пра тое,
чым яны зоймуцца пасля школы.
Такой шчаслівай Дзюнэ не была ўжо
вельмі даўно!



Яна зноў нахілілася над сшыткам
і працягнула пісаць.

Яе гісторыя скончвалася словамі:

*Маё сэрца скача ды смяецца.*



6+

Літаратурна-мастацкае выданне

**Лагеркранц** Роўз

# Маё сэрца скача ды смяецца

*для дзяцей малодшага школьнага ўзросту*

Ілюстрацыі *Эвы Эрыксан*

Пераклад са шведскай *Надзі Кандрусевіч*

Адказны за выпуск Надзя Кандрусевіч
Рэдактар Дзмітры Плакс
Тэхнічны рэдактар Алег Глекаў
Карэктар Алена Спрытніч

Падпісана да друку 22.06.2023. Друк афсетны.
Наклад 500 ас. Замова 353.

Выдавец ІП Кандрусевіч Надзея Канстанцінаўна.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/520 ад 11.08.2017.
Вул. Купалаўская, д. 11, в. Каралёў Стан, 223027, Мінскі раён, Мінская вобл.
Тэл. +375 29 509 14 16

Надрукавана ў ПУП «Джи энд Ди».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/36 ад 13.01.2014.
Вул. Бурдзейнага, 37-191, 220136, г. Мінск.



Гэта кніга пра Дзюнэ.

Так, пра дзяўчынку, якая заўжды шчаслівая.

Але ў той дзень Дзюнэ сядзела за сваёй партай у класе і глядзела на пустое месца побач.

На месца, дзе раней сядзела яе найлепшая сяброўка Эла-Фрыда, перад тым як з'ехала ў Нарчопінг.

З таго часу нікому нельга было сядзець там, бо дзе ж тады будзе сядзець Эла-Фрыда, калі вернецца?

— Эла-Фрыда не вернецца, — казала спадарыня настаўніца.

— Вы не можаце ведаць дакладна, — ціха адказвала Дзюнэ.

Яна ніколі не пераставала спадзявацца і верыць, нават калі ўсё здавалася безнадзейным...












ISBN 978-985-7277-12-4

9 789857 277124

EAC

выдавецтва KOSKA,

Лагеркранц • Эрыксан

# Маё сэрца скача ды смяецца

